Шыфр:___________________________

Колькасць балаў:_________________

Месца:__________________________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта,
намеснік Міністра адукацыі

___________ В.А. Будкевіч

«12» ____________ 2013 года

ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXIX РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І
«БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Брэст, 2013 г.*

## 10 клас

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

## Варыянт І

**Заданне 1.** Падкрэсліце правільныя напісанні ***Е*** і ***Э*** ў запазычаных словах.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

Бэжавы – бежавы, кібернэтыка – кібернетыка, купе – купэ, пепсі-кола – пэпсі-кола, маянез – маянэз, брунет – брунэт, віце-прэзідэнт – віцэ-прэзідэнт, дзепрэсія – дэпрэсія.

**Заданне 2.** Запішыце па ***2 розныя*** словы беларускай мовы, утвораныя ад наступных лацінскіх слоў.

***Узор:*** *civis ‘грамадзянін, дзяржава’ – цывілізацыя, цытадэль.*

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| **Лацінскае слова** | **Словы ў беларускай мове з гэтымі каранямі** |
|---|---|
| **nauta** ‘марак’ | |
| **dico** ‘гаварыць, называць’ | |
| **fixi** ‘прымацоўваць’ | |

**Заданне 3.** Запоўніце табліцу, склаўшы і запісаўшы 2 сказы, у якіх ***АДТАГО / АД ТАГО*** выконваюць розную сінтаксічную ролю.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Сказ | Часцінамоўная прыналежнасць *АДТАГО / АД ТАГО* | Сінтаксічная роля *АДТАГО / АД ТАГО* |
|---|---|---|
| 1) | | |
| 2) | | |

**Заданне 4.** Запішыце значэнне фразеалагізмаў з кампанентам ***ГАЛАВА***.

*Максімальная колькасць балаў – 10.*

| Фразеалагізм | Значэнне фразеалагізма |
|---|---|
| *браць у галаву штосьці* | |
| *вецер гуляе ў галаве* | |
| *выкінуць з галавы* | |
| *дайсці сваёй галавой* | |
| *карона з галавы не зваліцца (не ўпадзе)* | |
| *мець галаву на плячах* | |
| *на сваю галаву* | |
| *перакладаць з хворай галавы на здаровую* | |
| *прытуліць галаву* | |
| *сам чорт галаву зломіць* | |

**Заданне 5.** Падкрэсліце назоўнікі мужчынскага роду.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

Бязь, жмудзь, каламазь, кегель, лебедзь, пастараль, сажань, скрыжаль, цвіль, цюль.

**Заданне 6.** Рашыце сэнсавыя прапорцыі.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

Добры : ($x_1$) __________________ = любоў : нянавісць = ($x_2$) _______________ : грубы = надзейны : ($x_3$) __________________.

**Заданне 7.** Гэты вядомы беларускі пісьменнік, этнограф, краязнаўца, фальклырыст, журналіст, тэатральны крытык, які ў самыя змрочныя часы нашай гісторыі адстойваў самабытнасць і таленавітасць свайго народа і спрыяў папулярызацыі фальклорнай спадчыны беларусаў сярод адукаваных чытачоў, з'яўляецца аўтарам самай значнай самастойнай беларусазнаўчай лексікаграфічнай працы першай паловы XIX ст.

У прадмове да яе лексікограф піша, што імкнуўся пазнаёміць навуковыя колы Расіі з беларускай мовай, якая сама па сабе і створаныя на ёй пісьмовыя помнікі, вусныя паданні і легенды могуць даць даследчыкам багаты матэрыял для высвятлення асобных пытанняў мовы, гісторыі і, наогул, культуры іншых славянскіх народаў, перш за ўсё рускага, бо захоўваюць у сабе многа рэштак сівой даўніны.

Запішыце прозвішча аўтара і назву гэтай працы.

*Максімальная колькасць балаў – 2.*

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ______________________________________________

**Заданне 8.** Пісьмова адкажыце на наступныя пытанні.

*Максімальная колькасць балаў – 4* (1 бал за кожны правільны адказ).

**1.** Каго з беларускіх пісьменнікаў называлі "наш Дастаеўскі"?

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: Кузьма Чорны

**2.** Каму прысвяціў Я. Купала наступныя радкі: *"Чутка йграеш, гулка йграеш / Ты на скрыпачцы сваей, / К небу з думкай падлятаеш, / Шчасця зычыш для людзей"*?

Запішыце імя гэтага пісьменніка.

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: Цётка (Алаіза Пашкевіч)

**3.** Пра гэты твор Я. Купала сказаў: *"У гэту п'есу я ўклаў усё лепшае, што было ў маёй паэзіі і прозе".*

Як называецца гэты твор?

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: „Раскіданае гняздо"

**4.** Каму з герояў "Пінскай шляхты" В. Дуніна-Марцінкевіча належаць наступныя трапныя выказванні, прыказкі: *«здаровы, як рыжыкі баровы»*; *«уехаў у нерат – ні ўзад, ні ўперад»*; *«даганяючы не нацалуешся»*; *«калі абора цячэ, — гаспадыня бліны пячэ, а калі гумно цячэ, — гаспадар з хаты ўцячэ»*; *«млын меле — мука будзе, язык меле — бяда будзе».*

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: Куторга

**Заданне 9.** . Запішыце нумары правільных сцверджанняў.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

1) З герояў "Пінскай шляхты" характарыстыка *"Ён вельмі сярдзіты, бо адзін вус калом угору стаў"* адпавядае Пісулькіну. Кручкову

\+ 2) Максім Танк – "пясняр заходнебеларускіх барыкад".

3) Звесткі пра жыццё і асветніцкую дзейнасць Е. Полацкай дайшлі да нас з "Аповесці мінулых гадоў". Жыцце Е. П.

\+ 4) У творах М. Гарэцкага раскрываецца трагедыя чалавека ў гады Першай сусветнай вайны.

\+ 5) У структуру "Шляхціца Завальні" Яна Баршчэўскага ўваходзіць апавяданне "Плачка".

6) У выніку першай паездкі М. Багдановіча на Беларусь у 1911 г. ім быў напісаны цыкл вершаў "Мадонны". „Места", „Старая Беларусь"

\+ 7) Амфібрахій – трохскладовая стапа з націскам на другім (сярэднім) складзе.

8) Ф. Багушэвіч карыстаўся псеўданімам Яська-гаспадар з-пад Барысава. Вількі

\+ 9) Заснавальнікам рэнесанснага гуманізму ў беларускай літаратуры з'яўляецца Ф. Скарына.

10) Першы паэтычны зборнік Янкі Купалы – "На прасторах жыцця". Жалейка

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ______________________________________________

**Заданне 10.** Перад вамі *цэнтон* – верш, складзены з урыўкаў розных твораў аднаго ці некалькіх паэтаў.

Запішыце імёны і прозвішчы аўтараў асобных радкоў і назвы твораў, адкуль яны ўзятыя.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Падаюць сняжынкі –
дыяменты -росы,
Падаюць бялюткі
за маім акном.

П.Трус Дзесяты пацалунак

Што ім тыя пагоды паўднёвыя!
Што ім пышны платанавы рай,
Калі клічуць іх далі сасновыя
І азёрны рабінавы край!

Ставер „Жураўлі на Палессе ляцяць

Я верую, бясплодна не засне,
А ўперад рынецца, маўляў крыніца,
Каторая магутна, гучна мкне,
Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца.

М.Багд. „Санет“

АЎТАРЫ І НАЗВЫ
ІХ ТВОРАЎ: ______________________